З каталіцкіх СМІ Беларусі (26)

Аўтар: Рэдакцыя
06.03.2022 00:00

Біскуп Алег Буткевіч узначаліў у Расіцы ўрачыстасць у гонар мучанікаў II Сусветнай вайны. Расіца – асаблівае месца, дзе амаль 80 гадоў таму падчас нялюдскай карнай аперацыі ад рук нацыстаў загінула шмат бязвінных людзей. Нашы суайчыннікі згарэлі жыўцом, прыняўшы пакутніцкую смерць.

Сярод іх былі і два святары – марыяне Юрый Кашыра і Антоні Ляшчэвіч. Яны мелі магчымасць пазбегнуць страшнай смерці, зберагчы сваё жыццё, але ў хвіліну выпрабавання не пакінулі вернікаў.

“Людзі нашай зямлі, праяўляючы духоўны гераізм, ратавалі чалавека. І гаворка ідзе не толькі пра жыццё тут, на зямлі. Святары ратавалі людскія душы, каб, стаўшы перад Панам, яны маглі атрымаць жыццё вечнае”, – адзначыў іерарх.

Царква

Мы чакаем узнагароды за выкананне запаведзей, аднак самі запаведзі ёсць узнагарода, і яны не столькі пра прышласць, колькі пра цяперашнасць. Запаведзі ўжо самі па сабе бясцэнны скарб, ад якога нам робіцца добра ўжо зараз.

Занадта часта думаючы пра будучае, канцэнтруючы на ім сваю ўвагу і мэту, мы не цэнім “сёння”, у якім здзяйсняецца наша хада і ў якім мы маем шчасце бачыць плечы Госпада. Сённяшняе падобна да здароўя: яго не заўважаюць і не цэняць, пакуль не страцяць.

Нясследаванне за Езусам, жыццё не паводле запаведзяў, ізноў жа, не столькі пра будучую кару, колькі пра нямірнае, неспакойнае, нешчаслівае цяперашняе, у якім чалавек “сам у сабе атрымлівае належную адплату”.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (26)

Аўтар: Рэдакцыя
06.03.2022 00:00



